УДК 821.161.3

# МАСТАЦКІ ДОСВЕД ЭКСПРЭСІЯНІЗМУ Ў ВАЕННАЙ ПРОЗЕ АЛЕСЯ ГАРОДНІ

**З. І. Траццяк,**
*доктар філалагічных навук, прафесар кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0002-5752-9058*

Паступіў у рэдакцыю 13.02.2024.

UDC 821.161.3

# EXPRESSIONIST ARTISTIC EXPERIENCE IN ALES HARODNYA'S WAR PROSE

**Z. Tratsiak,**
*Doctor of Phililogy, Professor of the Department of World Literature and Foreign Languages of Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0002-5752-9058*

Received on 13.02.2024.

На матэрыяле апавядання «У поплавах» і аповесці «Варта на Рэйне» разглядаецца ідэйна-тэматычная і стылёвая адметнасць прозы А. Гародні, прысвечанай Першай сусветнай вайне. Падкрэсліваецца нетыповасць мастацкіх шуканняў аўтара (на мяжы мадэрнізму і рэалізму) для тагачаснай беларускай літаратуры. Вызначаецца ўплыў паэтыкі экспрэсіянізму на тэматыку (актуалізацыя падзей 1914–1918 гг. для савецкага чытача, адмысловая інтэрпрэтацыя «свайго» і «чужога», адлюстраванне трагічнага светаадчування чалавека ў памежнай сітуацыі) і спецыфіку аповеду згаданых вышэй твораў (постаць ненадзейнага апавядальніка; тэндэнцыя да мантажу невялікіх фрагментаў, якія, з аднаго боку, падкрэсліваюць каледаскапічнасць «эрзац»-жыцця, а з другога – падагульняюць вопыт тыповага чалавека на вайне; адмысловыя графічныя сродкі арганізацыі матэрыялу, кшталту «лесвіцы радкоў» і рытмізацыі празаічнага тэксту; натуралістычныя дэталі, якія дадаюць аповеду аўтэнтычнасці і драматызму).

*Ключавыя словы*: Першая сусветная вайна, беларуская літаратура, А. Гародня, паэтыка экспрэсіянізму, мантаж.

The ideological, thematic and stylistic distinctiveness A. Harodnya's prose, dedicated to the First World War, is examined on the basis of the short-story 'In the Water-Meadows' and the novel 'Die Wacht am Rhein'. The atypic nature of the author's artistic pursuits (on the border of modernism and realism) for Belarusian literature of that time is emphasized. The influence of the expressionist poetics on the subject matter (actualisation of the events of 1914 – 1918 for the Soviet reader; a special interpretation of the categories 'one's own' and 'alien'; a reflection of the person's tragic worldview in a critical situation) and the specifics of the narrative of the above-mentioned works (the character as an unreliable narrator; a tendency towards montage of small fragments that, on the one hand, emphasise the kaleidoscopic nature of 'ersatz' life, and on the other hand, summarise the experience of a typical person at war; special graphic means of organising the material, such as unique identation; rhythmicisation of the prose text; naturalistic details that add authenticity and dramatism to the narrative) are determined.

*Keywords:* the First World War, Belarusian literature, A. Harodnya, expressionist poetics, montage.

Літаратурна-мастацкая спадчына А. Гародні складаецца з аповесцей «На крэсах» [1] і «Варта на Рэйне» [2] (перавыдадзена ў 2021 г. [3]) і апавядання «У поплавах» [4]. Нягледзячы на сваю ідэйна-тэматычную адметнасць і эксперыменты з нарацыяй, творы шмат часу знаходзіліся па-за ўвагай літаратуразнаўчай супольнасці. Асобныя звесткі пра творчасць А. Гародні пададзены М. Гарэцкім у даследаванні «Маладняк за пяць гадоў». Навуковец засяродзіўся на аповесці «Варта на Рэйне», што вылучалася эмацыйна-футурыстычным стылем выкладу матэрыялу [5, с. 76], нязвыклым для тагачаснай беларускай прозы, якая звярталася да праблем мастацкага асэнсавання падзей недалёкага мінулага. Б. Мікуліч у нататцы «Пра аповесьці Гародні» крытычна выказаўся пра форму і змест «Варты на Рэйне»: «шматкроп'яў болей чымся слоў … Сказ пабудован самым прымітыўным спосабам. Нават вобразы ў падачы гэтымі сказамі губляюць сваю вартасць» [6, с. 7]. Пачатак XXI ст. вызначаецца цікавасцю да творчасці А. Гародні, бо «для нашай літаратуры ён быў постаццю неадназначнай, але сапраўды нетыповай» [7, с. 11]. В. Жыбуль спыніўся на асобных уласцівасцях прозы пісьменніка, «арганізаванай па законах тэксту паэтычнага, што падкрэсліваецца нестандартнай пунктуацыяй і тыпаграфікай <…> Мова – надзвычай лаканічная, часам пратакольная, утрымліваюцца і ўстаўкі ў выглядзе калонак газетнай хронікі, вылучаных адпаведным шрыфтам і ўзятых у рамкі» [8, с. 14]. Кнігі А. Гародні адкрыта канфрантуюць з папярэднімі маўленчымі практыкамі, што абслугоўвалі састарэлую літаратурна-мастацкую традыцыю адлюстравання баявых дзеянняў.

Згаданая спецыфіка твораў А. Гародні сведчыць пра яго далучанасць да гетэрагеннай плыні мадэрнізму, якая выяўляецца ў кан-

тэксце спадчыны прадстаўнікоў іншых літаратур. Адмысловыя пунктуацыя і тыпаграфіка поруч з узнаўленнем газетнай хронікі характарызуюць, напрыклад, трылогію «ЗША» Дж. Дос Пасаса. Важкімі рысамі твораў А. Гародні варта лічыць ускладнены сінтаксіс, мантаж знешне несумяшчальных дэталяў ці аповедавых стратэгій, зварот да трагічна-абсурдысцкіх сюжэтных ліній. Відавочна, аўтара вабілі мастацкія напрацоўкі экспрэсіяністаў, бо яны «абвастралі канфлікты, нагрувашчвалі гратэскавыя сітуацыі і <…> даводзілі чытача <…> да “шокавага” стану» [9, с. 36–37].

У аповесці «Варта на Рэйне» і апавяданні «У поплавах» А. Гародня актуалізаваў тэматыку, ідэалагічна неўхваленую ў савецкія часы, увасобіўшы вайну 1914–1918 гг. як трыгер, што распачне глабальны рэвалюцыйны рух. Празаік, які засвоіў асновы паэтыкі экспрэсіянізму, звярнуўся да тэмы вайны, што заняла адмысловае месца ў светаўспрыманні прадстаўнікоў гэтай плыні. А. Гародня ўвасобіў падзеі Першай сусветнай вайны, з аднаго боку, канстатуючы адметнасць ваеннага досведу для прадстаўнікоў розных этнасаў, і, з другога – сведчачы пра яе наднацыянальны, універсальна-негатыўны ўплыў («Час ішоў – час сьмяўся, – а людзі – зьбянтэжаныя, недалужныя, мізэрныя, няўцямныя, паслухмяныя, – хадзілі, беглі, езьдзілі, елі, пілі, галадавалі, гаравалі, і … старанна зьнішчалі адзін аднаго» [2, с. 61]). Згадкі пра мірнае існаванне і дэталёвы агляд працы ваеннага канверу, быццё тылу і фронту, лёсы немца і беларуса паяднаны экспрэсіяніцкай манерай выкладу матэрыялу, засяроджанай на «штодзённым болі, няверы ў разумнасць быцця, неадчэпным жаху за будучыню чалавека, чым жыццём кіруюць сацыяльныя механізмы, якія штохвілінна пагражаюць яму бессэнсоўнай пагібеллю» [10, сл. 1223].

У апавяданні «У поплавах» разгледжаны малапрыкметны эпізод сусветнай вайны. Галоўны герой твора – селянін Міхась Бык – вымушана развітаўся са звыклым жыццём на ўлонні палесскай прыроды, каб вытрываць выпрабаванне вайсковай службай ў час вайны. Яго несамавітае жыццё і трагічная смерць ажылі дзякуючы аповеду таварыша па службе, які ўразіўся апошнімі хвілінамі жыцця персанажа: той загінуў не ад варожай кулі ці снарада, а ад безасабовай «помсты» прыроды, шанаванай ім з дзяцінства.

Постаць апавядальніка выглядая таямніча. З яго словаў зразумела, што ён – удзельнік Першай сусветнай вайны, які спачатку абыякава прыгадвае нейкія толькі яму зразумелыя рэаліі вайны:

«… Парахонск, Лагішын, Пагост, Дуброва …

… 398-мы Мсьціслаўскі полк …

*– А мо' які іншы?*

Усё роўна» (курсіў наш. – З. Т.) [4, с. 23]. Вылучанае курсівам пытанне, на нашу думку, мае пэўны патэнцыял для інтэрпрэтацыі: з аднаго боку, гэта можа быць рэплікай іншага персанажа, які спрабуе наладзіць дыялог з апавядальнікам. Сапраўдная мэта такой камунікацыі застаецца нявысветленай: персанаж ці то ўдакладняе пэўныя акалічнасці, ці то чакае займальнай гісторыі, ці то спрабуе дапамагчы траўмаванаму вайной ветэрану выказацца. З іншага боку, дыялог успрымаецца як плён працы фантазіі апавядальніка (адзін з інварыянтаў «плыні свядомасці»), які спрабуе сістэматызаваць перажытае. Узнікае ўражанне, што персанаж не жадае кіравацца ў плынь успамінаў пра ўласныя нягоды ваеннага часу, таму прыгадвае лёсы іншых.

Паводле апавядальніка, негераічны выгляд цэнтральнага персанажа спалучаны з яго здатнасцю трымацца кодэксу паводзін, выпрацаванага на падставе жыццёвых нягод: ён «ваяваў старанна, працавіта, упарта, хаця і бяз жаднага захапленьня, так, як перад тэй самай вайною, без захапленьня, але вельмі старанна, вельмі працавіта, вельмі ўпарта, – араў поле, касіў сенажаць, карміў каня, вазіў жыта і канюшыну» [4, с. 24]. Штодзённая праца без захаплення саступіла месца заняткам, якія канчаткова прынізілі годнасць чалавека, пакідаючы пачуццё татальнай бездапаможнасці, бо ён «валяўся ў гнаі ў акопе, еў, піў, спаў у гразі, у зямлянцы, хадзіў у дазоры, харчаваўся гнілым салдацкім “абедам” (мяса з чарвякамі і тухлая каша з прагорклым алеем), грыз плесьнявелыя сухары, карміў уласным целам вошай» [4, с. 23–24]. Агіда памнажалася, калі ўжо на фронце шараговец прыгадваў, як у падрыхтоўчым лагеры займаўся «“палітграматай для дурняў”» [4, с. 25].

Празаік акрэсліў тыя імператывы, якія вызначалі светапогляд персанажа: «у жніўні 1914 году ён пазнаў, што дзеля таго, каб жыць, трэба адступаць, наступаць, страляць, ісьці ў штыкавую атаку, калоць ворага багнэтам у грудзі, руйнаваць, паліць, зьнішчаць» [4, с. 25]. Галоўны герой апавядання з вялікай цяжкасцю прыстасоўваўся да новых для сябе ўмоў існавання, бо яны патрабавалі ад асобы гіперадаптыўнасці і пэўнай рэзістэнтнасці да падзей і відовішчаў, траўматычных для нармальнай псіхікі.

Гароднеў апавядальнік характарызаваў вайсковае быццё Міхася Быка калейдаскапічна. У непарыўную плынь патрапілі назвы розных відаў зброі, населеных пунктаў, па якіх прайшлася сусветная вайна: «праз два гады бязупыннае страляніны выбуховымі брызантнымі снарадамі, шрапнэлямі, мінамі, гранатамі,

• з цяжкіх «бэрт», гаўбіц, лёгкіх палявых, зянітных, палегчаных горных і конна-артыле-

рыйскіх гармат, мартыр, мінакідаў, траскатлівых кулямётаў, бойкіх Люісаў і нязграбных трохлінейных наразных вінтовак, –

- пасьля двох гадоў атак, уцёкаў, адступленьняў і наступаў, –
- зьнішчыўшы: Усходнія Прусы, Заходнюю Галіцыю, Надкарпацьце і Паўночную Ўгоршчыну, –
- разрабаваўшы: Польшчу, Трансільванію, Падольле, Малдавію, Валынь, –
- спаліўшы і зруйнаваўшы дашчэнту добры кавалак Заходняй Беларусі з Віленшчынай, Горадзеншчынай, Беласточчынай, Падляшшам, Піншчынай, Навагрудчынай, –
- у канцы 1916-га году яго перавялі ў 75-ю дывізію, у 398 Мсьціслаўскі полк і загадалі "бараніць" ад "ворага" роднае Палесьсе, Міхась Бык толькі ўсьміхнуўся» [4, с. 26]. Апавядальнік, які сам з вялікай цяжкасцю аналізаваў тыповы вопыт салдата на сусветнай вайне, сінтэзаваў досвед Міхася Быка і ўласны. Пералік-мантаж геаграфічных назваў і ваенных тэрмінаў выглядае як нагрувашчванне выпадковых дэталяў, але выпадак – адна з праяў, вызначальных для быцця чалавека на фронце. Прапанаваныя дэталі актывізавалі ўяўленне чытача, які, не знайшоўшы тлумачэнняў апавядальніка ці гістарычнага каментару, самастойна рэканструяваў падзеі 1914–1916 гг. Надзвычай сінтаксічна ўскладнены сказ меў пэўны патэнцыял для сэнсавага разгортвання, але аўтар адмовіўся ад гэтага, абраўшы адну больш-менш лінейна выкладзеную сюжэтную лінію, звязаную з Міхасём Быком. Затое для чытача-сучасніка вайны выбраныя пісьменнікам дэталі ўзбуйняліся да сэнсава важкага «аб'ектыўнага карэляту», што стымуляваў нараджэнне індывідуальна афарбаваных асацыяцый.

У адрозненне ад апавядальніка, які разважаў пра мінулае і мадэляваў сваю слоўную версію падзей, Міхась Бык – удзельнік вайны, які прабыў у войску два гады, – толькі падыходзіў да звышсэнсу перажытага: «ён ня думаў, <…> бо знаў, што яшчэ не прышоў час яму думаць» [4, с. 26]. А. Гародня падкрэсліў зразумелую інтэлектуальную інэртнасць персанажа, пазбаўленага рэфлексіі, абыякавага да ўласнага разумовага патэнцыялу і фармулявання поглядаў на балючыя пытанні эпохі. Паводле характарыстыкі апавядальніка, герой знаходзіўся на пачатку маральна-інтэлектуальнага перараджэння. Таму «ня гледзячы на тое балючае пачуцьцё, якое адчувала пры аглядзе ўсяго гэтага заняпаду, усіх гэтых руін і вогнішчаў, яго здаровая, непапсаваная сялянская душа <…>, Міхась Бык старанна страляў, калоў, падпальваў, нішчыў» [4, с. 25].

Гароднеў апавядальнік адмыслова вырашыў праблему «свайго» і «чужога» (адну са значных у амбівалентнай мадэлі свету ў экспрэсіянізме), проціпаставіўшы дзве прасторы: «панства "іх": "ворагаў" – немцаў, мадзяраў, чэхаў, палякаў, харватаў, русін» [4, с. 27] і «сваё» войска, дзе разам служылі прадстаўнікі розных народаў, паяднаных у Расійскай імперыі. Шараговы салдат апынуўся ў мадэрнізаваным Вавілоне, дзе ў адно зліліся мовы і светапогляд індывідаў, дрэнна дасведчаных у найноўшых тэндэнцыях развіцця тагачаснай геапалітыкі. Для Міхася Быка (тыповага вайскоўца на сусветнай вайне) узаемадзення «свайго» і «чужога» – не абстракцыя, а штодзённы выклік, «нерв яго трагічнага светаадчування» [11, с. 506]. Такія малюнкі падкрэслівалі, наколькі любыя парасткі інтэрнацыяналізму значныя для А. Гародні, і падводзілі чытача да думкі, што гвалтоўная смерць – галоўны «чужы» для ўсіх удзельнікаў вайны незалежна ад іх веравызнання ці светапогляду. А. Гародня засведчыў, што падчас вайны архетыповыя вобразы гублялі стабільны змест; гэта адбівалася на сучасніку падзей, які засяроджваўся на пачуцці кагнітыўнага дысанансу, што ўзбуйнялася, бо быццё і «сваіх», і «чужых» выглядала аднолькава абсурдным: «там – палон, мардабой, голад, шпіёнабаязьлівасць, концэнтрацыйныя лягеры, поліцыя, колючы дрот <…> Тут – мардабой, начальства, "земгусары", шпіёнабаязьлівасць, контрразьведка, поліцыя, жандармэрыя» [4, с. 27].

Трагедыя Міхася Быка памнажалася, бо прастора вайны праглынула роднае яму Палессе. Назіраючы за балотам, каналам, поплавамі, ляском, персанаж з цяжкасцю пазнаў мясціны, якія некалі былі цэнтрам яго сусвету. Жах апанаваў героя, калі ён заўважыў, што пазнавальны ў агульных абрысах ландшафт падпарадкаваўся панаванню гвалтоўнай смерці. Адзначым пэўныя паралелі з аповесцю «Варта на Рэйне», галоўны герой якой таксама бачыў штучнасць падзелу на «сваіх» і «чужых» паводле дзяржаўнага падданства і, назіраючы за «мёртвым абшарам між "гэтай" і "таею" лініяй», адчуваў, што глядзіць на поле, «на якім расьце сьмерць» [2, с. 59]. Такім чынам, прыродны асяродак, па-першае, сімвалізаваў анталагічную стыхію, выяву лёсу, што збоку «пазірала» на мітусню людзей. Па-другое, пераадоленне балота ці нейтральнай прасторы – выпрабаванне слаба матываванай рызыкай для Міхася Быка ці Альфрэда Кляйна, і яно, верагодна, было б немагчымым для персанажаў у мірны час, бо авантуры не стасаваліся з іх уяўленнямі пра годны лад жыцця.

А. Гародня вызначыў той выпадак, калі праблема «свайго» і «чужога» вырашалася

з лёгкасцю. Пісьменнік, далёкі ад сучаснага расавага і этнічнага парадку дня, заўважыў, як еўрапейцы-ўдзельнікі вайны рэагавалі на прысутнасць на полі бою салдатаў з калоній: «стадам сапраўдных д'яблаў, зігзагамі бягуць “яны”. Блішчаць на сонейку іх чорныя, як вугаль твары; блішчаць, як сонца, вылупленыя бялкі вірлаў; блішчаць дыяментамі, мэрам ненатуральныя зубы» [2, с. 62]. Экзатычныя вераванні, нязвыклы выгляд і радыкальна іншы светапогляд шакіравалі і французаў, і немцаў, якія не маглі вымавіць і слова, калі назіралі за «нэграм, з нажом у зубах. У руках нешта накшталт драцянога абруча. Нахіляецца над трупам, бярэ нож, левай рукою хапае вуха мерцьвяка» [2, с. 63].

Ідэалагічная запраграмаванасць персанажа аповесці «Варта на Рэйне» звязана з уяўленнямі аўтара – «апалагета пралетарскай класавай культуры, які лічыў мастацтва сродкам класавай барацьбы, а пралетарскую літаратуру – зброяй, накіраванай супраць буржуазіі» [12, с. 126]. З іншага боку, персанаж-сацыяліст – постаць, якая дазваляла А. Гародню заглыбляцца ва ўласцівыя экспрэсіянізму праблемы, адлюстраваць «адкрытае адпрэчванне знешне разумных, а насамрэч ілюзорных, абмежавана-буржуазных і самазадаволена-прафанных уяўленняў» [13, с. 33]. Таму галоўная дзейная асоба аповесці – Альфрэд Кляйн – унутраны эмігрант, які хавае свой нон-канфармізм: «Ня любіць ён гэтых сьлінавых апавяданьняў пра “гэройскія ўчынкі нашых бравых нямецкіх салдацікаў” <…> Ня любіць ён гэтых апісаньняў розных дабрачынных вечароў “на карысьць раненых і інвалідаў”, якія наладжваюцца мяккасэрдымі акцыянерамі розных гарматных ці знарадных фабрык <…> Ня любіць ён гэтых фотографій, багата разаздобленых брыльлянтамі, не першае сьвежасці, сьлязлівых і тоўстых пань, чамусьці ўбраных у адзеньне “сястрыц міласэрных”, і чамусьці сфотографаваных у якім-кольвек шпіталі, каля ложка якой-кольвек ахвяры “каханьня да бацькаўшчыны”. Ня любіць ён гэтых высока-лунальных прамоў добрага старога кайзэра» [2, с. 73].

Аповесць А. Гародні, безумоўна, вылучаецца на фоне айчыннай літаратуры 1920 – 30-х гг., прысвечанай Першай сусветнай, бо аўтар узнаўляе эпізоды з жыцця немца. Тым не менш, гэтае жыццё не выглядае чужым і незнаёмым для беларускага чытача-сучасніка вайны, які разумеў разгорнутае параўнанне-супрацьпастаўленне: «Вайна – вар'яцтва, і згода, – часам, вар'яцтва! Вайна – бязглузьдзіца, і згода, – часам, бязглузьдзіца! Вайна – рабунак, і згода, – часам, рабунак!» [2, с. 106]. Акрамя таго, пісьменнік вылучыў шэраг эпізодаў, важкіх для ўсіх удзельнікаў вайны: «Зрэзаная, расьпятая, разарваная, разрытая зямля. У ёй – людзі <…> Мэрам тыя чарвячкі, такія мізэрныя нікчэмныя <…> Яны закапаліся ў траншэі, а зьверху, на паверхні – пекла. Рвуцца з усіх бакоў знарады, фантастычным казачным конікам стракоча кулямёт, суха вухкаюць гарматы, жабамі плююцца бомбакіды» [2, с. 27].

А. Гародня разважае пра персанажаў-цывільных, што ў Германіі патрапілі пад акупацыю і прыгадвалі вопыт знаёмства з казацкай навалай: «Прыйшлі да нас казакі <…> Прычапіліся да таты, каб дастаў сала … Узялі ўсё … Вечарам прыйшлі зноў па сала … Сала ня было … Раззлаваліся страшэнна … Засеклі … Матка, убачыўшы тату мёртвым, – упала: думалі – самлела … Лекар сказаў, разрыў сэрца … Вільлі забіў аднаго казака і ўцёк … Прычапіліся да мяне, п'яныя … Нарэшце я ўцякла» [2, с. 32]. Матыў гвалту, наканаванага цывільнаму, выяўляе тыпалагічныя сыходжанні твора А. Гародні (на ўзроўні перыпетый сюжэта) з аповесцю «Набліжэнне» З. Бядулі, дзе ахвярамі казакоў былі «свае» – яўрэі-жыхары мястэчка Каганцы, падданыя Расійскай імперыі. Незалежна ад нацыянальнасці ў персанажаў аповесці А. Гародні ўзнікала сакраментальная думка: «каму патрэбна вайна?» [2, с. 15].

У кантэксце твораў А. Гародні вайна ўспрымаецца як адмысловы шлях. Але рух па ім мітусліва-імпульсіўны, бессэнсоўны: «як ашалелыя ішлі людзі, войскі, ішлі коньнікі, ішла артылерыя <…> як ашалелыя насіліся цягнікі: з людзьмі, з войскамі, з гарматамі, з амуніцыяй, з харчамі» [2, с. 36]. У такіх умовах чалавек забываўся на сапраўдны змест стваральнай працы, даводзячы быццё да абсурду. Гэты звыродны стан грамадства падкрэслены дзякуючы катэгорыі «эрзац»: «у буфеце – “эрзац”-папіросы, “эрзац”-піва, “эрзац”-кава, – усё сурогаты <…> сурогатныя сустрэчы, сурогатныя прыяцелі» [2, с. 76]. Асацыятыўны ланцужок лёгка пашыраўся да «эрзац»-думак, «эрзац»-пачуццяў і «эрзац»-жыцця. А. Гародня звярнуў увагу на тое, наколькі жыхары акупаваных беларускіх тэрыторый зненавідзілі *«Ordnung»* – неад'емную частку «эрзац»-жыцця, падрыхтаванага кайзераўцамі.

Прааналізаваныя вышэй творы выдатна ілюструюць вектар развіцця беларускай прозы пра Першую сусветную вайну. У апавяданні «У поплавах» А. Гародні стала распрацаваны цэлы шэраг канцэптуальна значных для айчыннай літаратурна-мастацкай баталістыкі матываў: навала-кантунуум, вайна-рух, вайна-звыродная праца. У творы ў сканцэнтаванай форме разгледжаны комплекс грамадска-палітычных праблем, звязаных з успрыманнем «свайго» і «чужога», створаны шэраг эпізодаў,

якія сведчаць пра лёсавызначальнасць выпадку. А. Гародня абраў знешне непрыкметныя падзеі вайны, якія, тым не менш, выбітна ілюстравалі атмасферу свайго часу. Лёс галоўнага героя сімвалізаваў марнасць смерці ўсіх ахвяр бойні, якія не атрымалі права на ўласны «голас» падчас узброенага канфлікту імперый. Канцэптуальна значна тое, што аўтар абраў экспрэсіяністкую манеру аповеду, якая стасуецца з ідэяй адлюстравання дысгарманічнасці ваеннага жыцця. У аповесці «Варта на Рэйне» пісьменнік правёў мастацкі эксперымент, заснаваны на наўмыснай рытмізацыі тэксту, каб прапанаваць чытачу запамінальны аўдыёвізуальны малюнак франтавога жыцця пад час атакі. А. Гародня стварае празмерна доўгія сказы-перыяды, дзе, у асноўным, спалучаліся дэталі рэчыўнага свету, а каментар апавядальніка ці персанажа вынесены ў падтэкст.


*Літаратура*

1. *Гародня, А.* На крэсах: (аповесць) / А. Гародня. – Менск : Выданне ЦБ «Маладняка», 1927. – 116 с.
2. *Гародня, А.* Варта на Рэйне / А. Гародня. – Менск : Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1930. – 122 с.
3. *Гародня, А.* Варта на Рэйне / А. Гародня. – Мінск : «Галіяфы», 2021. – 204 с.
4. *Гародня, А.* У поплавах: Апавяданьне / А. Гародня // Маладняк. – 1927. ‒ № 7 – 8. – С. 23–35.
5. *Гарэцкі, М.* «Маладняк» за пяць гадоў. 1923–1928 гг. / М. Гарэцкі. – Менск : Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1928. – 122 с.
6. *Мікуліч, Б.* Пра аповесьці Гародні / Б. Мікуліч // Літаратурны дадатак да газэты «Савецкая Беларусь». – 1928. – № 13. – С. 7.
7. *Жыбуль, В.* «Пружанскі барон». Жыццё і творчасць Алеся Гародні / В. Жыбуль // Роднае слова. – 2014. – № 2. – С. 9–11.
8. *Жыбуль, В.* Пра Алеся Гародню і яго аповесць «Варта на Рэйне» / В. Жыбуль // Варта на Рэйне / А. Гародня. – Мінск : Галіяфы, 2021. – С. 3–27.
9. *Лявонава, Е.* Плыні і постаці. З гісторыі сусветнай літаратуры другой паловы XIX–XX стагоддзяў. Дапаможнік для настаўнікаў / Е. Лявонава. – Мінск : Рэдакцыя часопіса «Крыніца», 1998. – 336 с.
10. *Зверев, А.* Экспрессионизм / А. Зверев // Литературная энциклопедия терминов и понятий / гл. ред. А. Николюкин. – М. : НПК «Интелвак», 2001. – Ст. 1222–1224.
11. *Пестова, Н.* Своё и чужое / Н. Пестова // Энциклопедический словарь экспрессионизма. – М. : ИМЛИ РАН, 2008. – С. 506–508.
12. *Багдановіч, І.* Гародня Алесь / І. Багдановіч // Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1993. – Т. 2. – С. 126.
13. *Россиянов, О.* Алогизм / О. Россиянов // Энциклопедический словарь экспрессионизма. – М. : ИМЛИ РАН, 2008. – С. 33–34.

*References*

1. *Garodnya, A.* Na kresah: (apovesc') / A. Garodnya. – Mensk : Vydanne CB «Maladnyaka», 1927. – 116 s.
2. *Garodnya, A.* Varta na Rejne / A. Garodnya. – Mensk : Belaruskae dzyarzhaŭnae vydavectva, 1930. – 122 s.
3. *Garodnya, A.* Varta na Rejne / A. Garodnya. – Minsk : «Galiyafy», 2021. – 204 s.
4. *Garodnya, A.* U poplavah: Apavyadan'ne / A. Garodnya // Maladnyak. – 1927. ‒ № 7 – 8. – S. 23–35.
5. *Garecki, M.* «Maladnyak» za pyac' gadoŭ. 1923–1928 gg. / M. Garecki. – Mensk : Belaruskae dzyarzhaŭnae vydavectva, 1928. – 122 s.
6. *Mikulich, B.* Pra apoves'ci Garodni / B. Mikulich // Litaraturny dadatak da gazety «Saveckaya Belarus'». – 1928. – № 13. – S. 7.
7. *Zhybul', V.* «Pruzhanski baron». Zhyccyo i tvorchasc' Alesya Garodni / V. Zhybul' // Rodnae slova. – 2014. – № 2. – S. 9–11.
8. *Zhybul', V.* Pra Alesya Garodnyu i yago apovesc' «Varta na Rejne» / V. Zhybul' // Varta na Rejne / A. Garodnya. – Minsk : Galiyafy, 2021. – S. 3–27.
9. *Lyavonava, E.* Plyni i postaci. Z gistoryi susvetnaj litaratury drugoj palovy HIH–HH stagoddzyaŭ. Dapamozhnik dlya nastaŭnikaŭ / E. Lyavonava. – Minsk : Redakcyya chasopisa «Krynica», 1998. – 336 s.
10. *Zverev, A.* Ekspressionizm / A. Zverev // Literaturnaya enciklopediya terminov i ponyatij / gl. red. A. Nikolyukin. – M. : NPK «Intelvak», 2001. – St. 1222–1224.
11. *Pestova, N.* Svoyo i chuzhoe / N. Pestova // Enciklopedicheskij slovar' ekspressionizma. – M. : IMLI RAN, 2008. – S. 506–508.
12. *Bagdanovich, I.* Garodnya Ales' / I. Bagdanovich // Belaruskiya pis'menniki: Biyabibliyagrafichny sloŭnik: u 6 t. – Minsk : Belaruskaya encyklapedyya, 1993. – T. 2. – S. 126.
13. *Rossiyanov, O.* Alogizm / O. Rossiyanov // Enciklopedicheskij slovar' ekspressionizma. – M. : IMLI RAN, 2008. – S. 33–34.